Родныя тапонімы

# СТАЙКІ — ЖЫТЛО ПАСТУХОЎ?..



На вашы пытанні адказвае старшыня Рэспубліканскай тапанімічнай камісіі пры НАН Беларусі Ігар КАПЫЛОЎ

***Паважаная рэдакцыя!***

***Прашу вас расказаць гісторыю паходжання назвы вёскі Стайкі, якая знаходзіцца ў Баранавіцкім раёне Брэсцкай вобласці. Акрамя таго, яна яшчэ носіць назвы трох маленькіх вёсак: Ламашы, Некрашы і Зароўе. Чаму так адбылося, не ведаю, буду вельмі ўдзячна, калі патлумачыце мне.***

***Ёсць у нашай вёсцы маёнтак (а дакладней, яго рэштکі), у якім з 1947 года размяшчалася наша школа. Апошні пан, які валодаў ім, меў прозвішча Лашкевіч. Кажуць, што ранейшымі яго гаспадарамі былі Ганібалы. Але ад іх маёнтак перайшоў у іншыя рукі: ці то ў карты прайгралі, ці то па якой іншай прычыне.***

***Кожны нумар вашай газеты чытаю з вялікай цікавасцю. Бо, чытаючы яе, я размаўляю па-беларуску, узгадваю родную мову і вельмі ганаруся ёй.***

**Марыя Траяновіч,** *г. Мінск.*

Паважаная Марыя! На жаль, навуковая анамастычная літаратура, а таксама энцыклапедычныя даведнікі змяшчаюць даволі скупыя звесткі як пра гісторыю, так і пра паходжанне назвы вёскі Стайкі Баранавіцкага раёна. Звычайна апісанне гісторыі вёскі абмяжоўваецца перыядам з пачатку XX стагоддзя да нашых дзён. Затое надзвычай цікавую інфармацыю пра гэта паселішча месцяць разнастайныя краязнаўчыя крыніцы. Менавіта дзякуючы ім можна даведацца, што гэты населены пункт узгадваецца ўжо ў XIV стагоддзі. На той час вёска мела іншае найменне — Зарас.

Напачатку паселішчам валодаў прадстаўнік татарскага княжацкага роду Гусэйн Малікбаш. Пазней, у 1563 годзе, ён прадаў маёнтак Стайкі з навакольнымі землямі Богушу Аўсянніку. З 1571 года Стайкі сталі ўласнасцю дзяржаўнага і грамадскага дзеяча Вялікага Княства Літоўскага, мецэната-асветніка, канцлера ВКЛ Яўстафія Валовіча. Па сведчанні краязнаўцаў, у 1787 годзе маёнтак для асабістага пражывання набыў дваранін Мсціслаўскага ваяводства Тамаш Здань Пушкін. Пры гэтым сцвярджаецца, што род Пушкіных вядомы на тэрыторыі Беларусі з 1514 года. Больш за тое, ёсць меркаванне, што і знакаміты рускі паэт Аляксандр Сяргеевіч Пушкін адносіцца да гэтай жа галіны роду. Так гэта ці не пакажуць новыя гістарычныя даследаванні, якія, упэўнены, адкрыюць цікавыя, невядомыя нам факты.

Краязнаўцамі адзначаецца таксама, што амаль на працягу ста гадоў Стайкі пераходзілі ў спадчыну да розных прадстаўнікоў роду Пушкіных. Апошнім уладаром маёнтка з іх роду быў Тамаш Калікст Рафалавіч Пушкін.

Пасля 1876 года сядзіба перайшла да прадстаўнікоў яшчэ аднаго старажытнага беларускага роду — Лашкевічаў. Якім чынам і чаму, невядома, а таму і з'яўляюцца розныя інтрыгуючыя версіі накшталт таго, што ён быў прайграны ў карты. У «Геаграфічным слоўніку Каралеўства Польскага і іншых славянскіх краін», выдадзеным у Варшаве ў 1880–1902 гадах, засведчана, што да 1868 года ў Стайках была каталіцкая капліца. Новыя ўласнікі маёнтка Лашкевічы ўпарадкавалі парк, закладзены яшчэ пры Пушкіных, а таксама заклалі новы. Акрамя таго, гаспадарлівыя ўладары пабудавалі тут палац, сыраварню, лядоўню, цагельны завод. Апошнімі ў дарэвалюцыйны час уладальнікамі Стаек былі Іосіф Лашкевіч, з 1911 года — Адольф Іосіфавіч Лашкевіч, а з 1914 года — Наталля Грыцыянаўна Лашкевіч. У гаспадароў маёнтка, верагодна, былі вялікія планы па яго развіцці. Пра гэта, напрыклад, сведчыць той факт, што Іосіф Лашкевіч у 1900 годзе звярнуўся ў мінскае губернскае праўленне з просьбай дазволіць яму будаўніцтва на сваіх землях вінакурні (выказваецца гіпотэза, што ў сувязі з гэтым у арнаменце над уваходам у палац адлюстраваны кілішак) і атрымаў станоўчы адказ. Аднак вядомыя падзеі пачатку XX стагоддзя не дазволілі рэалізавацца задуманым планам. На вялікі жаль, палацава-паркавы комплекс, які па праве можна лічыць гісторыка-культурным і архітэктурным помнікам XIX — XX стст., на сённяшні дзень, мяркуючы па фотаздымках, знаходзіцца ў занядбаным стане і ў хуткім часе можа ўвогуле знікнуць, а мы назаўсёды страцім унікальны аб'ект гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі.

Вёсак з назвай *Стайкі* даволі многа на тэрыторыі нашай краіны. Аднайменныя паселішчы сустракаюцца ў Аршанскім, Браслаўскім, Верхнядзвінскім, Мёрскім, Ушацкім, Чашніцкім раёнах Віцебскай вобласці, у Івацэвіцкім раёне Брэсцкай вобласці, а таксама ў Барысаўскім, Валожынскім, Вілейскім, Лагойскім, Мінскім раёнах Мінскай вобласці. Яшчэ больш населеных пунктаў з такой назвай было ў мінулым. Пра гэта сведчаць звесткі надзвычай каштоўнай крыніцы па гісторыі мясцовасцей былой Рэчы Паспалітай — «Геаграфічнага слоўніка Каралеўства Польскага і іншых славянскіх краін». Нярэдка сустракаюцца такія ж назвы на землях Украіны і Расійскай Федэрацыі. Гэта сведчыць пра тое, што слова *стайкі* з'яўляецца агульнаўсходнеславянскім. Яно з'яўляецца вытворным ад слова *стаі,* якое на розных усходнеславянскіх тэрыторыях мела рознае значэнне. Так, у мясцовых гаворках украінцаў *стая, стайка* — гэта жытло пастухоў, разнавіднасць шалаша ў гуцульскіх пастухоў. У дыялектах рускай мовы *стаі* — гэта хлявы для жывёлы, канюшні. У заходніх рэгіёнах Беларусі (на Гродзеншчыне) слова *стая* захавалася як земляробчы тэрмін са значэннем «гоня, паласа зямлі ў сто метраў». У старабеларускай мове ўжывалася слова *стай* для абазначэння даўжыні, роўнай прыкладна 80 метрам.

Да Стаек былі далучаны тры невялікія вёсачкі: *Ламашы, Некрашы і Зароўе.* Назвы Ламашы і Некрашы адносяцца да ліку родавых найменняў і ўказваюць на групу сваякоў па імені-мянушцы або прозвішчы *Ламаш* і *Някраш.* У беларускай іменаслоўнай сістэме сустракаюцца прозвішчы *Ламаш, Ломаш, Ломашаў, Ламашук.* Вядомы даследчык у галіне беларускай антрапаніміі акадэмік Мікола Васільевіч Бірыла звязвае паходжанне гэтых прозвішчаў з дыялектным словам *ламаш* («старая паламаная рэч»). Слова *някраш* у старажытнасці ўжывалася ў адносінах да непрыгожага чалавека. Існуе і іншая версія ўзнікнення гэтага прозвішча. Многія старажытныя славянскія імёны, якія потым перайшлі ў прозвішчы, выконвалі не толькі ідэнтыфікуючую, але і ахоўную функцыю. У тыя часы нашы продкі вельмі часта давалі сваім дзецям немілагучныя імёны або імёны з адмоўным значэннем, каб абараніць іх ад усялякіх злых сіл.

Назва *Зароўе* ўказвае на месца размяшчэння паселішча — за ровам.

***P.S.*** *Шаноўныя чытачы! Вас цікавіць, што азначае назва горада, вёскі ці мястэчка, у якіх вы жывяце? А можа, той мясцовасці, адкуль вы родам? Вам хочацца ведаць, адкуль пайшлі найменні пэўных урочышчаў, лясоў, азёр, што размяшчаюцца ў вашай мясцовасці? Тады дасылайце свае лісты з пытаннямі на адрас: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага 10а, газета «Звязда». Або па электроннай пошце: igumenski@mail.ru з пазнакай «Родныя тапонімы».*